ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 370.17.044.3

Пашкевіч Уладзімір Вячаслававіч

# ФАРМІРАВАННЕ МАРАЛЬНЫХ КАШТОЎНАСНЫХ АРЫЕНТАЦЫЙ ВУЧНЯЎ 5 - 7 КЛАСАЎ СРОДКАМІ ВУСНАЙ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ

13.00.01 - агульная педагогіка

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата педагагічных навук

Віцебск 1996

Праца выканана ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце

| | | |
|---|---|---|
| Навуковы кіраўнік | - | член - карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Грымаць А.А. |
| Афіцыйныя апаненты | - | доктар педагагічных навук, прафесар Казімірская І.І. |
| | - | кандыдат педагагічных навук, дацэнт Шанін М.А. |
| Апаніруючая арганізацыя | - | Нацыянальны інстытут адукацыі |

Абарона адбудзецца " 20 " чэрвеня 1996 года ў 14 00 гадзін на пасяджэнні Савета па абароне дысертацый К 02.20.01 на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук у Віцебскім дзяржаўным універсітэце: 210036, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33 (корпус МГФ), ауд. 407.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Віцебскага дзяржаўнага універсітэта.

Аўтарэферат разасланы " 18 " мая 1996 г.

Вучоны сакратар Савета па абароне дысертацый — кандыдат педагагічных навук, прафесар Сталярова С.І.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

*Актуальнасць даследавання* вызначаецца грамадскай патрэбнасцю ў фарміраванні сацыяльна актыўнай асобы, з устойлівай сістэмай маральных каштоўнасных арыентацый.

Дынаміка сацыяльна-палітычнага пераўладкавання грамадства садзейнічае перасэнсаванню асноў духоўнага жыцця, маральных арыенціраў. У гэтых умовах падрастаючае пакаленне застаецца найбольш неабароненым ад уплыву негатыўных фактараў. У той жа час менавіта ў падлеткавым узросце найбольш інтэнсіўна ідзе працэс фізічнага, сацыяльнага станаўлення асобы, ствараюцца перадумовы культурнай самаідэнтыфікацыі, уваходжання ў свет нацыянальнай культуры. Педагагічная думка актыўна шукае новыя шляхі да вырашэння ўзнікшай праблемы на аснове аксіялагічных падыходаў да працэсу маральнага выхавання. Асноўныя педагагічныя падставы фарміравання асобы падлетка-уключэнне ў сітуацыю выбару каштоўнасцей, іх асэнсаванне, маральна-матываваныя адносіны, дапамога ў ацэнцы і самаацэнцы сваіх дзеянняў, учынкаў.

Сучасная парадыгма выхавання прадугледжвае стварэнне неабходных умоў для пазнання, асэнсавання і выбару тых або іншых маральных каштоўнасцей, стымуляцыю гэтага выбару і далейшую ўнутраную працу школьніка над сваімі ўчынкамі і дзеяннямі.

Педагагічныя аспекты праблемы фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый школьнікаў разглядаліся ў працах Д.І.Вадзінскага, К.У.Гаўрылавец. А.А.Грымаця, І.І.Казімірскай, І.С.Мар'енка, І.Ф.Харламава.

Пытанням вывучэння маральных каштоўнасных арыентацый асобных сацыяльных груп, арыентацыі іх на пэўныя каштоўнасці, карэкцыі маральных каштоўнасных арыентацый прысвечаны даследаванні А.Ю.Драбейніка, Т.А.Канавалавай.

Шэраг вучоных-даследчыкаў В.І.Казлоў, М.С.Каган, Б.Ц.Ліхачоў, Б.М.Неменскі, Б.П.Юсаў даследавалі праблему ўплыву мастацтва на маральнае развіццё асобы.

Шырокі спектр маральных каштоўнасцей для асобы прапаноўвае вусная народная творчасць. Сёння можна з упэўненасцю сцвярджаць, што шматвяковая народная традыцыя стварыла беспамылковую сістэму адбору і захавання найбольш каштоўнага і значнага з усяго таго, што было створана масавай мастацкай творчасцю.

Асаблівае гучанне ў беларускім фальклоры набыла маральная праблематыка. Існуюць агульначалавечыя маральныя каштоўнасці, якія не

могуць страціць свайго значэння, нягледзячы на ўсе грамадскія катаклізмы. Гэтыя каштоўнасці цудоўна адлюстраваны ў вуснай народнай творчасці. Арыентацыя на іх школьнікаў- важная задача школы ў сучасных умовах.

На педагагічныя ідэі, закладзеныя ў шматлікіх жанрах вуснай народнай творчасці, яшчэ ў XIX ст. звярталі ўвагу даследчыкі беларускага фальклору М.В.Доўнар-Запольскі, Я.Ф.Карскі, І.І.Насовіч, М.Я.Нікіфароўскі, Е.Р.Раманаў, А.К.Сержпутоўскі, П.В.Шэйн, П.М.Шпілеўскі і інш. Гэтай праблеме прысвечана асобнае даследаванне А.Я. Багдановіча "Педагогические воззрения белорусского народа". На выхаваўчыя магчымасці беларускіх казак, песень, прыказак, балад, легенд, паданняў звярталі ўвагу даследчыкі Г.А.Барташэвіч, М.Я.Грынблат, К.П.Кабашнікаў, А.С.Ліс, А.С.Фядосік, І.К.Цішчанка і інш.

Сёння шырока разглядаюцца пытанні сутнасці і зместу, форм і метадаў выхавання сродкамі народнай педагогікі ў сістэме дашкольнага выхавання (А.А.Грымаць, Т.В.Паздзеева, Л.А.Панько і інш.). Змест народнай педагогікі, яе метады, сродкі ўздзеяння на асобу дзіцяці даследуе Г.П.Арлова.

Разам з тым, праблема фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый сродкамі вуснай народнай творчасці даследавана недастаткова.

Зыходзячы з актуальнасці праблемы, яе сацыяльна-педагагічнай значнасці, была вызначана тэма даследавання "Фарміраванне маральных каштоўнасных арыентацый вучняў 5- 7 класаў сродкамі вуснай народнай творчасці".

*Аб'ект даследавання-* маральныя каштоўнасныя арыентацыі вучняў 5- 7 класаў.

*Прадмет даследавання-* працэс фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый вучняў 5- 7 класаў сродкамі вуснай народнай творчасці.

*Мэта даследавання-* вывучыць маральныя каштоўнасныя арыентацыі падлеткаў, вызначыць аптымальныя шляхі і распрацаваць эфектыўныя формы іх карэкцыі, станаўлення і фарміравання сродкамі вуснай народнай творчасці

Мэта канкрэтызавалася ў наступных *задачах*:

1. Абгрунтаваць патрабаванні да ўзроўняў сфарміраванасці маральных каштоўнасных арыентацый вучняў 5- 7 класаў.

2. Распрацаваць і апрабіраваць методыку фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый сродкамі вуснай народнай творчасці

3. Вывучыць патэнцыяльныя магчымасці факультатыўных заняткаў па вуснай народнай творчасці ў працэсе фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый.

4. Распрацаваць метадычныя рэкамендацыі для настаўнікаў па фарміраванні маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў сродкамі вуснай народнай творчасці.

Стан праблемы, характарыстыка аб'екта і прадмета, мэта і задачы даследавання дазволілі нам сфармуляваць наступную *гіпотэзу даследавання*:

- мэтавая накіраванасць факультатыўных заняткаў па вуснай народнай творчасці, пазакласная работа, пабудаваная з выкарыстаннем беларускага фальклору, беларускіх народных традыцый, садзейнічае паскарэнню працэсу фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў, іх станаўленню і развіццю;

- развіццё эмацыянальна-пачуццёвай сферы падлеткаў станоўча ўплывае на фарміраванне іх маральных каштоўнасных арыентацый сродкамі вуснай народнай творчасці;

- дзейнасны падыход у працэсе фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый вызначае яго выніковасць.

*Метадалагічнай асновай даследавання* паслужылі палажэнні дыялектыкі аб сутнасці асобы як сукупнасці адносін, аб сацыяльнай дэтэрмінацыі паводзін асобы, аб сацыяльнай абумоўленасці фарміравання асобы школьніка і яе маральных каштоўнасных арыентацый.

Працэс фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый вучняў 5- 7 класаў разглядаўся ў трох аспектах:

- філасофскім: аб дыялектыцы суадносін індывідуальнага, нацыянальнага і агульначалавечага як рэальных стасункаў філасофскіх катэгорый "агульнага, асаблівага і адзінкавага";

- псіхалагічным: аб актывізацыі пачуццёвай сферы асобы падлетка як узроставых дамінант, на якіх засноўваецца пабуджэнне да маральна насычанай дзейнасці;

- педагагічным: аб залежнасці працэсу фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый ад адзінства мэт, задач, зместу, форм, метадаў і сродкаў навучання і выхавання.

Для вырашэння пастаўленых задач і праверкі гіпотэзы выкарыстоўвалася комплексная методыка даследавання, якая ўключала ў сябе тэарэтычныя і эмпірычныя *метады*: вывучэнне і аналіз школьнай дакументацыі, мэтанакіраванае назіранне, анкетаванне, інтэрв'юіраванне, гутарку, сацыяметрычныя методыкі; аналіз педагагічнага вопыту і педагагічнай практыкі аўтара; псіхолага-педагагічны эксперымент; якасны аналіз статыстычных матэрыялаў.

Даследаванне праводзілася ў 4-ы этапы:

На 1-м этапе (1991- 1992гг.) вывучалася філасофская, псіхалага педагагічная літаратура па тэме даследавання; удакладняўся змест асноўных паняццяў, якія звязаны з аб'ектам і прадметам даследавання, кампаненты, крытэрыі і паказчыкі ўзроўняў сфарміраванасці маральных каштоўнасных арыентацый вучняў 5- 7 класаў; распрацоўвалася праграма і даследчая методыка эксперыментальнай работы, фармулявалася гіпотэза.

На 2-м этапе (1992- 1993гг.) былі вывучаны ўзроўні маральнай выхаванасці, сфарміраванасці маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў, вылучаны групы ў залежнасці ад узроўню сфарміраванасці маральных каштоўнасных арыентацый, створана даследчая група па праблеме.

На 3-м (1993- 1995гг.) праводзіўся фарміруючы этап эксперыменту, мэтай якога была праверка эфектыўнасці распрацаванай аўтарам методыкі ў адпаведнасці з вылучанай гіпотэзай.

На 4-м этапе (1995г.) праводзілася абагульняючая работа, аналізаваліся і сістэматызаваліся эксперыментальныя дадзеныя, удакладняліся і правяраліся атрыманыя вынікі даследча-эксперыментальнай работы, афармлялася дысертацыя.

База даследавання- сярэднія школы №№ 1,28 г.Віцебска, №№ 13,16 г.Полацка, Альгоўская СШ Віцебскага раёна. У эксперыменце ўдзельнічалі 334 школьнікі падлеткавага ўзросту (5- 7-я класы).

*Навуковая навізна і тэарэтычная значнасць даследавання* заключаюцца ў тым, што распрацаваны крытэрыі і паказчыкі сфарміраванасці маральных каштоўнасных арыентацый вучняў 5- 7 класаў, выяўлены ўзроўні сфарміраванасці маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў. У даследаванні даказана, што прапанаваная методыка знаёмства з вуснай народнай творчасцю з'яўляецца дзейсным сродкам фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый школьнікаў у выпадку прытрымлівання педагагічных умоў, якія вызначаны ў працэсе эксперыменту.

*Практычная значнасць даследавання* заключаецца ў распрацоўцы і апрабацыі методыкі вызначэння ўзроўняў сфарміраванасці маральных каштоўнасных арыентацый школьнікаў. Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны і выкарыстоўваюцца ў рабоце настаўнікаў, пры чытанні лекцый, спецкурсаў, правядзенні спецсемінараў і практычных заняткаў на факультэтах беларускай філалогіі педВНУ, курсах павышэння кваліфікацыі настаўнікаў, у працэсе далейшага даследавання праблем удасканалення маральнага выхавання школьнікаў.

*Дакладнасць вынікаў даследавання* забяспечваецца навуковай метадалогіяй, сістэмай метадаў і методык, адэкватных задачам, аб'екту і прадмету даследавання; спалучэннем колькаснага і якаснага аналізаў; матэматычнай апрацоўкай эмпірычных дадзеных.

*Эканамічная значнасць* атрыманых вынікаў вымяраецца якаснымі змяненнямі ў структуры асабістай іерархіі маральных каштоўнасцей вучняў 5- 7 класаў. Вынікі гэтых змяненняў непазбежна праявяцца ў жыццядзейнасці грамадства. Атрыманыя дадзеныя таксама будуць садзейнічаць больш хуткаму і эфектыўнаму вырашэнню праблем маральнага выхавання падлеткаў, адкрыццю новых перспектыў далейшага даследавання праблемы.

*Асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону*:

1. Аксіялагічны разгляд маральных каштоўнасных арыентацый дазваляе вызначыць іх як інтэгратыўную характарыстыку асобы, у якой спалучаюцца кагнітыўны, эмацыянальны і канатыўны кампаненты.

2. У сістэме маральнага выхавання важная роля належыць вуснай народнай творчасці беларускага народа. Гэта абумоўлена тым, што працэс выхавання, які створаны народам, мае выключную выхаваўчую сілу, з якой не параўнаецца ніводная сістэма, заснаваная на абстрактных ідэях.

3. Працэс фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый грунтуецца на эмацыянальна насычаным успрыманні твораў вуснай народнай творчасці, асэнсаванні іх і практычнай рэалізацыіі засвоеных нормаў і прынцыпаў у штодзённых паводзінах.

4. Грунтоўнай заканамернасцю працэсу фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый з'яўляецца ўлік патрэбнасцей асобы і яе магчымасці ў маральным развіцці.

*Асабісты ўклад саіскальніка.* Дысертацыя ўяўляе сабой самастойную навуковую працу, якая абапіраецца на дасягненні вучоных і практыкаў Рэспублікі Беларусь, сусветнай псіхолага-педагагічнай навукі.

*Апрабацыя і ўкараненне вынікаў даследавання.* Асноўныя вынікі даследавання заслухоўваліся і абмяркоўваліся на кафедры педагогікі; навуковых канферэнцыях прафесарска-выкладчыцкага саставу (1994- 1995гг.); 1-й, 2-й, 3-й, 4-й навуковых канферэнцыях аспірантаў і маладых вучоных (г.Віцебск, 1993, 1994, 1995гг.); рэспубліканскай навуковай канферэнцыі "Навукова-тэарэтычная спадчына К.Д.Ушынскага і сучасныя праблемы развіцця педагагічнай навукі" (г.Віцебск, 1994г.); рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі "Праблема стварэння нацыянальнай сістэмы падрыхтоўкі педагагічных кадраў для дашкольных устаноў Рэспублікі Беларусь" (г.Мінск, 1994г.); міжнароднай

канферэнцыі "Развіццё нацыянальнай сістэмы падрыхтоўкі педагагічных кадраў" (г.Мінск, 1994г.); рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі "Арганізацыя навукова-даследчай работы студэнтаў і навучэнцаў педагагічных навучальных устаноў" (г.Мінск, 1995г.).

*Апублікаванасць вынікаў.* Матэрыялы даследавання знайшлі адлюстраванне ў 10 публікацыях аўтара ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый.

*Структура і аб'ём дысертацыі.* Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, дзвюх глаў, вывадаў і 6 дадаткаў. У ёй змяшчаецца 149 старонак, 20 табліц і 11 малюнкаў. Спіс выкарыстаных крыніц уключае ў сябе 221 найменне.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ПРАЦЫ

**У першай главе** "Тэарэтыка-метадалагічныя асновы фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў" раскрываецца змест, сутнасць і структура паняццяў "каштоўнасць", "каштоўнасная арыентацыя", "маральная каштоўнасць", "маральная каштоўнасная арыентацыя", "ацэнка", "маральная якасць", што дало магчымасць даследаваць працэс фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый вучняў 5- 7-х класаў сродкамі вуснай народнай творчасці.

Пытанню каштоўнасцей прысвяцілі шмат цікавых і змястоўных прац айчынныя і замежныя даследчыкі С.Ф.Анісімаў, Л.М.Архангельскі, А.М.Бакурадзе, У.А.Блюмкін, Д.І.Вадзінскі, У.А.Васіленка, К.У.Гаўрылавец. А.А.Грымаць, І.В.Грышына, А.Р.Драбніцкі, А.Р.Здравамыслаў, І.І.Казімірская, А.І.Кір'якова, В.І.Казлоў, Л.М.Косарава, Г.І.Курган, Т.Б.Любімава, Л.І.Рувінскі, А.А.Ручка, В.М.Сагатоўскі, В.П.Тугарынаў, А.К.Уледаў, Н.З.Чаўчавадзе, У.А.Ядаў і інш.

Прадметам нашага даследавання з'яўляецца катэгорыя "маральная каштоўнасць". Гэта паняцце ўказвае на чалавечае, сацыяльнае, культурнае значэнне пэўных аб'ектаў і з'яў рэчаіснасці, іх уласцівасцей, а таксама абстрактных ідэй, у якіх увасабляюцца грамадскія і маральныя ідэалы і якія выступаюць як эталон неабходнага. На нашу думку, маральная каштоўнасць- гэта значэнне прадмета, з'явы, якасці, тая роля, якую яны могуць адыграць у жыцці і дзейнасці асобы з пункту погляду яе патрэбнасці, інтарэсаў, мэт. Яна ўзнікае тады, калі суб'ект уступае ў якую-небудзь сувязь, адносіны для задавальнення патрэбнасцей, што ўзнікаюць у працэсе дзейнасці.

Свядома ці неўсвядомлена, засвойваючы або не прымаючы пэўныя маральныя каштоўнасці грамадства, вучань набывае пэўныя маральныя якасці, якія ў многім вызначаюць яго як асобу. Мы лічым, што паняцці "каштоўнасць" і "якасць" знаходзяцца ў цеснай узаемасувязі. Якасць становіцца каштоўнасцю тады, калі асоба не мае гэтай якасці, але хацела б яе набыць. Калі ж гэта якасць становіцца рысай свядомасці і паводзін асобы, то можна гаварыць аб тоеснасці, супадзенні паняццяў "каштоўнасць" і "якасць". Таму можна даць наступнае азначэнне маральным якасцям. Маральныя якасці- рысы свядомасці і паводзін, якія характэрныя або могуць быць характэрнымі для пэўнай асобы і ў якіх праяўляецца яе маральнасць. Зразумела, што паняцце "каштоўнасць" шырэйшае за паняцце "якасць". Не кожная маральная якасць можа суадносіцца з маральнай каштоўнасцю.

З паняццем "каштоўнасць" цесна звязана і паняцце "ацэнка". Каштоўнасці адлюстроўваюцца ў свядомасці людзей у выглядзе ацэначных меркаванняў, ацэнак. У іх характарызуецца значэнне прадмета для людзей, якія уступаюць з гэтым прадметам у якія-небудзь адносіны. Ацэнкі выконваюць перш за ўсё функцыю рэгулятара ў асэнсаванні назапашанага досведу. З дапамогай ацэнкі вызначаецца тое новае, што з'явілася ў гэтым досведзе, яго месца і роля ў жыццядзейнасці суб'екта ацэнкі. А таму ацэнка- крыніца новых ідэй, уяўленняў, новых задач. Ацэнка можа здзяйсняць пераацэнку каштоўнасцей, што дэтэрмінуюць змяненне значнасці выніку папярэдняй ацэнкі. Пераацэнка звязана як са змяненнем дзейнасці суб'екта, так і са змяненнем аб'ектыўных умоў на розных этапах развіцця асобы.

На аснове пазнання і ўсведамлення каштоўнасцей і ацэнак фарміруюцца каштоўнасныя арыентацыі. Тыя каштоўнасці, якія атрымліваюць станоўчую ацэнку, перарастаюць у каштоўнасныя арыентацыі. Ролю каштоўнасных арыентацый у развіцці асобы мы разглядаем праз адносіны чалавека да яго патрэбнасцей. У структуры асобы патрэбнасці выконваюць асаблівую ролю- яны выступаюць галоўнай пабуджальнай сілай яе паводзін, крыніцай актыўнасці, асновай сістэмы матывацыі. У сувязі з гэтым, каштоўнасная арыентацыя- якасны кампанент структуры асобы, які ўплывае на разумнае спалучэнне і развіццё яе патрэбнасцей, інтарэсаў, матываў, адносін, сацыяльных установак і пэўным чынам рэгулюе яе паводзіны.

Пад маральнай каштоўнаснай арыентацыяй мы разумеем усю сукупнасць маральных арыенціраў паводзін чалавека (правіл, норм, ацэнак, паняццяў, прынцыпаў, ідэалаў). Маральная каштоўнасная арыентацыя- кампанент структуры асобы, што вылучае яе як прадстаўніка пэўнага ўзроўню і тыпу

культуры, як прыхільніка дадзенага тыпу маралі. Мы зыходзім з таго, што маральная каштоўнасная арыентацыя ўключае ў сябе кагнітыўны, эмацыянальны, канатыўны кампаненты. Педагагічны аспект праблемы маральных каштоўнасных арыентацый, мы лічым, неабходна бачыць і рашаць у такім накірунку, каб шырокі спектр аб'ектыўных маральных каштоўнасцей зрабіць прадметам усведамлення і перажывання як асобных патрэбнасцей засваення, рэалізацыі гэтых каштоўнасцей.

Важным сродкам фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый малодшых падлеткаў з'яўляецца вусная народная творчасць- фальклор. У фальклоры праяўляюцца лепшыя рысы нацыі, ідэалы гуманізму. Намі былі прааналізаваны дзіцячы фальклор (калыханкі, забаўлянкі, дзіцячыя песні і гд.), народныя казкі, прыказкі і прымаўкі, легенды, каляндарна-абрадавая і сямейна-абрадавая паэзія беларусаў, пазаабрадавыя песні, балады; выяўлена багацце маральных каштоўнасцей, якім народ аддаваў прыярэтэт. Аналіз паказаў, што які б жанр вуснай народнай творчасці не разглядаўся намі, у кожным з іх выражаны маральныя погляды, перакананні, нормы, прынцыпы нашага народа, недвухсэнсоўна аддаецца перавага маральным каштоўнасцям, якія вытрымалі выпрабаванне часам, асуджаюцца амаральныя якасці асобы. Кожны з жанраў беларускага фальклору з'яўляецца цудоўным матэрыялам для далучэння падлеткаў да маральных каштоўнасцей, прапаноўвае шырокія магчымасці выбару гэтых каштоўнасцей.

На аснове аналізу вынікаў канстатуючага этапа эксперыменту намі былі вылучаны ўзроўні ўсведамлення маральных катэгорый, эмацыянальна-каштоўнасных адносін падлеткаў да твораў вуснай народнай творчасці, норм паводзін і ўмоўна раздзелены школьнікі кантрольных і эксперыментальных класаў на тры групы ў залежнасці ад узроўню сфарміраванасці маральных каштоўнасных арыентацый (высокі, сярэдні, нізкі ўзроўні).

**У другой главе** "Працэс фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый вучняў 5- 7-х класаў у вучэбнай і пазакласнай рабоце" раскрываецца змястоўны бок фарміруючага этапа эксперыменту і аналізуюцца яго вынікі.

Асноўнай формай працы па фарміраванні маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў мы выбралі факультатыўныя заняткі. Выбар наш не быў выпадковым. Па-першае, той колькасці гадзін, якая адводзіцца на азнаямленне вучняў з вуснай народнай творчасцю, недастаткова, каб сфарміраваць пэўныя ўяўленні падлеткаў аб багацейшай культурнай спадчыне іх продкаў, каб выхоўваць новыя пакаленні прадаўжальнікамі родных этнакультурных традыцый. Па-другое, факультатыўныя заняткі- адна з найлепшых форм

арганізацыі дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі навучэння школьнікаў. Менавіта факультатыўныя заняткі даюць настаўніку шырокі спектр магчымасцей выкарыстання рознабаковых сродкаў і форм індывідуалізыцыі, якія па тых або іншых прычынах не могуць быць выкарыстаны на класна-ўрочных занятках. Па-трэцяе, факультатыўныя заняткі пазбаўляюць школьніка аднатыповасці, "прыеўшыхся" рамак і садзейнічаюць стварэнню атмасферы даверу і эмацыянальнага камфорту. Яны таксама даюць больш шырокія магчымасці настаўніку рашыць праблемы матывацыі і стымулявання навучальнай дзейнасці школьніка (напрыклад, ацэнка дзейнасці вучня толькі добрымі адзнакамі, двойкі і тройкі не ставяцца і г.д.).

Пры распрацоўцы праграмы эксперыменту і асноўнай формы яго правядзення- факультатыўных заняткаў па вуснай народнай творчасці- мы зыходзілі з таго, што працэс азнаямлення вучняў з фальклорнымі творамі, фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый павінен будавацца ў адпаведнасці з важнейшымі дыдактычнымі прынцыпамі: сістэматычнасці, паслядоўнасці, даступнасці, улікам узроставых і індывідуальных асаблівасцей вучняў 5- 7-х класаў. Мы імкнуліся ўключыць у праграму такія фальклорныя творы, якія б абуджалі ў вучняў унутраную патрэбнасць стаць на пэўную пазіцыю, вызначыць свае погляды на свет, на ўчынкі людзей, ацаніць іх. Творы вуснай народнай творчасці, уключаныя намі ў праграму факультатыва, адпавядаюць узроўню агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі і псіхалагічнаму развіццю вучняў дадзенай узроставай групы. Мы таксама зыходзілі з таго прынцыпу, што правільны падбор твораў вуснай народнай творчасці не павінен пакінуць абыякавым нават так званых пасіўных дзяцей.

Эксперыментальную работу мы праводзілі ў наступнай паслядоўнасці.

1. Знаёмства дзяцей з разнастайнымі жанрамі вуснай народнай творчасці беларусаў, эпохай, калі былі створаны гэтыя творы. На першым этапе важным было пашырыць веды вучняў аб фальклоры, паказаць багацце і непаўторнасць, асаблівасці паэтыкі беларусаў, сфарміраваць цікавасць да твораў вуснай народнай творчасці.

2. Фіксацыя ўвагі вучняў на творах маральна-этычнага характару, выпрацоўка умення вылучаць іх з шэрагу іншых фальклорных твораў. Вучні павінны былі не проста назваць такія творы, але і вызначыць маральна-этычныя праблемы, якія ў іх закранаюцца.

3. Асэнсаванне ўражання ад знаёмства з фальклорным творам. Вылучэнне вобразаў і іх ацэнка школьнікам. Першасная ідэнтыфікацыя ўласнага "я" і

мастацкага вобраза. Вычляненне маральных якасцей , якімі надзяліў народ тых або іншых фальклорных герояў.

4. Супастаўленне сваёй уласнай ацэнкі (ацэнкі вучня) з ацэнкай, закладзенай у творы. Вылучэнне ідэі фальклорнага твора. Ацэнка вобраза, твора з пункту погляду грамадскай маралі.

5. Правядзенне параўнальнага аналізу фальклорных твораў на маральна-этычную тэматыку беларусаў з творамі іншых народаў нашых суседзяў (для вучняў 7-х класаў). На гэтым этапе для нас важным было падкрэсліць адзінства маральных нормаў, правіл, прынцыпаў, якія прад'яўляюцца рознымі народамі, грамадствамі да асобы.

6. Уключэнне падлеткаў у творчую дзейнасць па інсцэніроўцы твораў вуснай народнай творчасці, фальклорных свят, запісе мясцовага фальклору і г.д. Канчатковая ідэнтыфікацыя "я" падлетка з фальклорным вобразам. Пры гэтым варта зазначыць, што пад першаснай ідэнтыфікацыяй мы разумеем першаснае, у нейкай ступені павярхоўнае знаёмства-"прыцірку" з фальклорным вобразам, асэнсаванне першых уражанняў ад знаёмства. Пад поўнай ідэнтыфікацыяй мы разумеем "зліццё" "я" вучня з фальклорным вобразам, што можа быць дасягнута выключна праз дзеянне падлетка.

Праводзячы эксперыментальную работу, мы карэкціравалі яе ў залежнасці ад сфарміраванасці ўзроўняў маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў на канстатуючым этапе эксперыменту.

Працэс фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый вучняў у значнай ступені залежыць ад правільнай арганізацыі работы, накіраванай на развіццё іх пачуццёва-эмацыянальнай сферы. Пад паняццем "эмацыянальная сфера" мы разумеем такое кола паняццяў, як эмоцыі, пачуцці, перажыванні, настрой, тыя, якія характэрныя для арганізаванага выхаваўчага працэсу школьнікаў. Гэта работа ўключала ў сябе:

- пашырэнне форм і прыёмаў эмацыянальнага стымулявання, форм работы для вучняў 5- 7-х класаў з выкарыстаннем вуснай народнай творчасці;

- стварэнне эмацыянальнай кантактнасці ў адносінах настаўнік-вучань, вучань-вучань;

- правядзенне інтэграваных заняткаў сумесна з настаўнікамі музыкі, малявання, гісторыі. Варта запрашаць мясцовых жыхароў, якія ведаюць фальклорныя творы і могуць іх эмацыянальна выканаць;

- прадуманае знешняе афармленне заняткаў па вуснай народнай творчасці, пазакласных мерапрыемстваў: музычнае афармленне, светавое, дэкарацыі і г.д.;

- падбор маральнай інфармацыі, да ўспрыняцця якой вучань падрыхтаваны. Прапанаваная намі праграма факультатыва, як нам здаецца, прытрымліваецца гэтага прынцыпу;

- развіццё ўяўленняў вучняў, іх фантазіі.

Эмацыянальны фон, насычаны станоўчымі эмоцыямі, садзейнічае таму, што падлетак не толькі ацэньвае маральную дзейнасць фальклорных персанажаў, ён самаацэньвае сябе, шляхам параўнання сябе з фальклорнымі героямі. Працэс такога параўнання мае двухбаковы характар: дзіця пазнае сябе ў параўнанні з іншымі, а іншых- у параўнанні з сабой, што садзейнічае фарміраванню маральных каштоўнасных арыентацый.

Праводзячы эксперыментальную работу, мы падбіралі такія маральныя сітуацыі з фальклорных твораў, дзе напружанне ў барацьбе дабра са злом дасягае найвышэйшага развіцця. Чым больш драматычна напружаны сюжэт твора, тым большы эмацыянальны водгук на яго.

На факультатыўных занятках, у час пазакласнай работы мы імкнуліся не хаваць сваіх пачуццяў, эмоцый, заўсёды выказвалі свой пункт гледжання, былі непасрэднымі ўдзельнікамі самых розных форм працы, а не толькі кіравалі гэтай працай. Мы імкнуліся стварыць атмасферу добразычлівасці, зацікаўленасці, увагі да выказванняў і ацэначных меркаванняў вучняў.

Вырашаючы важную задачу па засваенні вучнямі маральных норм, закладзеных у творах вуснай народнай творчасці, развіцці пачуццёва-эмацыянальнай сферы падлетка, фарміраванні грамадска карысных норм паводзін, мы зыходзілі з таго, што работа гэта павінна праводзіцца ў цесным адзінстве. Нельга зацікавіць вучняў творамі вуснай народнай творчасці, не закрануўшы іх пачуцці, не адзначыўшы высокамаральныя паводзіны герояў шматлікіх фальклорных жанраў, не ўключыўшы школьнікаў у практычную дзейнасць. Таму распрацаваныя заняткі, заданні, па магчымасці, неслі на сабе нагрузку гэтай трыадзінай задачы.

У працэсе далучэння падлетка да маральных каштоўнасцей грамадства, фарміравання яго маральных каштоўнасных арыентацый важнае значэнне адыгрывае дзейнасны падыход.

Рэальным прадаўжэннем нашай эксперыментальнай работы стала ўключэнне вучняў 5- 7-х класаў у практычную дзейнасць, звязаную з выкарыстаннем твораў вуснай народнай творчасці, іх зборам і прапагандай. З гэтай мэтай намі быў створаны фальклорны гурток "Вытокі", у які ўваходзілі вучні эксперыментальных класаў. Пасяджэнне гуртка праходзіла адзін раз на два тыдні. Падлеткі збіраліся, каб пагуляць у прапанаваныя настаўнікам народныя

гульні, паспаборнічаць, прыняць удзел ў інсцэніроўцы некаторых фальклорных твораў, у арганізацыі і правядзенні фальклорна-этнаграфічных свят і г.д. Тэму чарговага пасяджэння іншы раз непасрэдна падказвалі члены гуртка.

Пасля правядзення эксперыментальнай работы была здзейснена кантрольная дыягностыка ў кантрольных і эксперыментальных класах. Дадзеныя, выяўленыя намі, дазволілі пацвердзіць эфектыўнасць распрацаванай методыкі і канстатаваць, што прапанаваная намі праграма аказала ўплыў на фарміраванне маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў эксперыментальных класаў. У ходзе эксперыментальнай работы пашырыліся веды дзяцей аб вуснай народнай творчасці, маральных каштоўнасцях нашага народа, чалавецтва ў цэлым. Дзеці з цікавасцю разважалі аб адметных асаблівасцях беларускага фальклору, яго непаўторнасці. Больш багатым стаў слоўнікавы запас падлеткаў, у мове яны сталі часцей выкарыстоўваць эпітэты, параўнанні, метафары, прыказкі і прымаўкі.

Праведзеная намі эксперыментальная работа паўплывала і на развіццё пачуццёва-эмацыянальнай сферы падлеткаў. Школьнікі эксперыментальных класаў з цікавасцю наведвалі кожныя заняткі, прапаноўвалі свае тэмы чарговых заняткаў, з хваляваннем і эмацыянальна ўзнёсла ці саркастычна з'едліва зачытвалі кожны фальклорны твор. Лёгка было заўважыць, як дзеці хвалююцца за лёс станоўчых герояў. У сваіх выказваннях школьнікі ці па-добраму спачувалі фальклорным персанажам, ці гнеўна асуджалі іх амаральныя ўчынкі. З радасцю дзеці ўдзельнічалі ў пасяджэннях клуба "Вытокі", не трэба было доўга запрашаць падлеткаў прыняць удзел у іншых школьных культурных мерапрыемствах. Факультатыўныя заняткі, удзел у фальклорных святах спрыялі паляпшэнню настрою дзяцей. Падлеткі сталі ганарыцца тым, што, як і іх продкі, яны могуць прадоўжыць традыцыі, што ўзніклі з незапамятных часоў; што могуць адкрыць для сябе духоўны сэнс звычаяў, абрадаў нашых прашчураў, у сваім жыцці дзейнічаць так, каб не выклікаць асуджэння з боку іншых. Дзеці з радасцю дзяліліся сваімі ведамі з бацькамі, знаёмымі.

Адбыліся пэўныя змены і ў паводзінах школьнікаў эксперыментальных класаў. Вучні сталі больш самастойнымі, ініцыятыўнымі, з большай павагай сталі адносіцца да старэйшых, з большай увагай- да малодшых, пашырылася ўзаемадапамога паміж членамі класнага калектыву. Многія вучні эксперыментальных класаў з задавальненнем сталі наведвацца ў малодшыя класы, аказваць дапамогу школьнікам 1- 4-х класаў у падрыхтоўцы да свят, спартыўных мерапрыемстваў, разам удзельнічалі ў "Вячорках".

У выніку праведзенай намі эксперыментальнай работы змянілася колькасная і працэнтная суадносенасць вучняў эксперыментальных класаў,

падзеленых умоўна намі на тры групы ў залежнасці ад узроўню сфарміраванасці маральных каштоўнасных арыентацый на канстатуючым этапе эксперыменту (вынікі адлюстраваны на малюнку).




Дынаміка сфарміраванасці маральных каштоўнасных арыентацый вучняў 5-7-х эксперыментальных і кантрольных класаў (у %).

## ВЫВАДЫ

1. Працэс фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў сродкамі вуснай народнай творчасці на аснове аксіялагічнага падыходу дазваляе актуалізаваць маральныя патрэбнасці вучняў, садзейнічае пошуку каштоўнасцей, якія іх задавальняюць. Асобасна-дзейнасны падыход стымулюе фарміраванне маральных каштоўнасных арыентацый вучняў 5 - 7 класаў.

2. Тэарэтычна абгрунтавана і практычна даказана, што ў агульнай сістэме фарміравання асобы, яе адносін да акаляючай рэчаіснасці, сацыялізацыі важная роля належыць фарміраванню ў падлеткаў маральных каштоўнасных арыентацый, якія ўяўляюць сабой складанае інтэгратыўнае ўтварэнне і ўплываюць на ўнутраныя матывы рэгуляцыі паводзін, дзейнасці падлеткаў.

3. Фарміраванне маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў уяўляе сабой складаную праблему, вырашэнне якой магчыма на аснове сістэмна-структурнага падыходу, які засноўваецца на ўзаемадзеянні кагнітыўнага, эмацыянальнага і канатыўнага кампанентаў і вызначэння асобасных утварэнняў і якасцей падлеткаў, іх маральных каштоўнасцей, маральных ведаў, ведаў вуснай народнай творчасці, якія забяспечваюць паспяховае выкананне задач па фарміраванні ў іх маральных каштоўнасных арыентацый сродкамі вуснай народнай творчасці.

4. Вывучэнне праблемы фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый школьнікаў сродкамі вуснай народнай творчасці паказала, што ў школах праводзіцца пэўная работа ў гэтым накірунку. Аднак педагагічная эфектыўнасць, выніковасць гэтага працэсу невысокая. Прычыны такога становішча абумоўлены недастатковай распрацаванасцю пытання ў псіхолага-педагагічнай літаратуры, адсутнасцю ў неабходнай колькасці для правядзення выхаваўчай працы фальклорнай літаратуры, адсутнасцю праграм па арганізацыі факультатыўных заняткаў па вуснай народнай творчасці, нераўнамерным уключэннем дзяцей у дзейнасць па арганізацыі і правядзенні фальклорных свят, зборы твораў вуснай народнай творчасці.

5. Аналіз сфарміраванасці кампанентаў маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў дазваляе канстатаваць, што вучні 5 - 7-х класаў характарызуюцца рознымі ўзроўнямі дадзенага ўтварэння (высокім, сярэднім, нізкім). Эксперыментальныя дадзеныя раскрываюць агульнае і адрознае маральных каштоўнасных арыентацый хлопчыкаў-падлеткаў і дзяўчынак-падлеткаў.

6. Аптымізацыя працэсу фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый вучняў 5- 7-х класаў сродкамі вуснай народнай творчасці патрабуе:

- уліку ўзроўню сфарміраванасці ў падлеткаў маральных каштоўнасных арыентацый, ступені праяўлення кожнага структурнага кампанента дадзенага ўтварэння і вызначэння перспектывы яго развіцця;

- выкарыстання дадатковай колькасці гадзін, вызначаных праграмай на вывучэнне вуснай народнай творчасці праз сістэму факультатыўных заняткаў;

- развіцця эмацыянальна-пачуццёвай сферы падлеткаў праз комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на вырашэнне гэтай задачы;

- уключэння падлеткаў у творчую дзейнасць па арганізацыі і правядзенні фальклорных свят, пасяджэнняў фальклорных гурткоў, зборы фальклорных твораў і г.д;

- улік патрэбнасцей асобы і яе магчымасцей у маральным развіцці.

7. Пазітыўны ўплыў на фарміраванне маральных каштоўнасных арыентацый вучняў 5- 7-х класаў будзе аказваць паэтапная праца, накіраваная на вывучэнне фальклорных твораў, у працэсе якой паступова павінна фіксавацца ўвага падлеткаў на творах маральна-этычнага характару, фарміравацца ўменне ацаніць твор, вобраз з пункту погляду ўласных уяўленняў і патрабаванняў грамадскай маралі.

8. Інтэнсіўнасць і эфектыўнасць фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў сродкамі вуснай народнай творчасці залежыць ад шырокага ўключэння падлетка ў ацэначную дзейнасць.

Дадзенае даследаванне не вычэрпвае ўсіх аспектаў пастаўленай праблемы. Далейшай распрацоўкі патрабуюць наступныя пытанні :

- уплыў ацэначных меркаванняў настаўнікаў, бацькоў, равеснікаў на фарміраванне маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў сродкамі вуснай народнай творчасці;

- уплыў самаацэнкі падлетка на фарміраванне яго маральных каштоўнасных арыентацый ;

- фарміраванне маральных каштоўнасных арыентацый школьнікаў сродкамі вуснай народнай творчасці на ўроках беларускай мовы і літаратуры.

# СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ

1. Педагагічная практыка: выхаванне сродкамі нацыянальнай літаратуры //Непрерывная практическая подготовка студентов 1-5 курсов педвузов к учебно- воспитательной работе в школе: Мат. межвуз. науч.-практ. конф.- Витебск, 1993. - С.78-79.
2. Вусная народная творчасць як сродак духоўнага ўзбагачэння вучняў //Матэрыялы 1-й навук. канф. аспірантаў і малад. вучоных.- Віцебск, 1993. - С.42-43.
3. Выхаваўчая сутнасць прыказак і прымавак //Матэрыялы 2-й навук. канф. аспірантаў і малад. вучоных.- Віцебск, 1993.- С.33-35.
4. Узбагачэнне школьнікаў нацыянальна-культурнымі традыцыямі беларускага народа ва ўмовах летніка //Сценарии. Метод. рекомендации для студентов- практикантов.- Витебск, 1993.- С.1-4.
5. Актуальнасць ідэі народнасці выхавання К.Д. Ушынскага //Научно-теоретическое наследие К.Д. Ушинского и современные проблемы развития педагогической науки: Мат. республ. конф.- Витебск, 1994.- С.39.
6. Вусная народная творчасць- важны сродак падрыхтоўкі будучага настаўніка да выхаваўчай працы ва ўмовах нацыянальна-культурнага адраджэння //Развіццё нацыянальнай сістэмы падрыхтоўкі пед. кадраў: Збор. арт.- Мн., 1994.- С.172-173.
7. Выхаванне патрыятычных пачуццяў сродкамі вуснай народнай творчасці //Праблема стварэння нацыянальнай сістэмы падрыхтоўкі педагагічных кадраў для дашкольных устаноў Рэспублікі Беларусь: Мат. навук.-практ. канф.- Мн., 1994.- С.142-144.
8. Навукова-даследчая работа студэнтаў як сродак фарміравання прафесіяналізму настаўнікаў //Арганізацыя навукова-даследчай работы студэнтаў і навучэнцаў педагагічных навучальных устаноў: Мат. навук.-практ. канф.- Мн., 1995.- С.155- 156.
9. Напярэдадні Купалля (інсцэніраваная казка) //Метод. рекомедации в помощь организаторам летнего отдыха детей.- Витебск, 1995.- С.30-34.
10. Развіццё эмацыянальна-пачуццёвай сферы малодшых падлеткаў- важная ўмова фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый сродкамі вуснай народнай творчасці (сааўтар- Махіня В.У.) //Фарміраванне асобы студэнта і школьніка на аснове духо ўных каштоўнасцей грамадства: Мат. Рэспуб. навук.-практ. канф.- Мн., 1996.- С.73-74.

# РЭЗЮМЕ


**Пашкевіч Уладзімір Вячаслававіч**

**Фарміраванне маральных каштоўнасных арыентацый вучняў 5 - 7 класаў сродкамі вуснай народнай творчасці.**

Ключавыя словы: вусная народная творчасць, асобасна-дзейнасны падыход, маральная ацэнка, маральная каштоўнасная арыентацыя, маральная каштоўнасць, маральная якасць, патрэбнасць, пачуццёва-эмацыянальная сфера.

Аб'ектам дысертацыйнага даследавання былі маральныя каштоўнасныя арыентацыі вучняў 5 - 7 класаў. Мэтай даследавання стала вывучэнне маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў, вызначэнне аптымальных шляхоў і распрацоўка эфектыўных форм іх карэкцыі, станаўлення і фарміравання сродкамі вуснай народнай творчасці.

У працэсе даследавання выкарыстоўвалася комплексная методыка, якая ўключала вывучэнне і аналіз навуковай літаратуры па тэме даследавання, школьнай дакументацыі, мэтанакіраванае назіранне, анкетаванне, інтэрв'юіраванне, гутаркі, сацыяметрычныя методыкі, аналіз педагагічнага вопыту аўтара, псіхолага-педагагічны эксперымент, якасны аналіз вынікаў эксперыменту, статыстычных дадзеных.

Вынікі даследавання дазволілі на аснове аксіялагічнага падыходу распрацаваць крытэрыі і паказчыкі, вызначыць узроўні сфарміраванасці маральных каштоўнасных арыентацый вучняў 5 - 7 класаў.

На падставе распрацаванай методыкі вывучэння і выкарыстання твораў вуснай народнай творчасці вызначаны аптымальныя шляхі і формы паспяховага фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый вучняў 5 - 7 класаў.

Апрабаваныя формы і метады фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый падлеткаў сродкамі фальклору прыменены і могуць быць выкарыстаны ў рабоце настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, пры чытанні лекцый, спецкурсаў, правядзенні спецсемінараў і практычных заняткаў на факультэтах беларускай філалогіі педагагічных ВНУ, курсах павышэння кваліфікацыі настаўнікаў, у працэсе далейшага даследавання праблем маральнага выхавання.

# РЕЗЮМЕ

**Пашкевич Владимир Вячеславович**

**Формирование нравственных ценностных ориентаций учащихся 5- 7 классов средствами устного народного творчества.**

Ключевые слова: устное народное творчество, личностный деятельностный подход, моральная оценка, нравственная ценностная ориентация, нравственная ценность, нравственное качество, потребность, чувственно-эмоциональная сфера.

Объектом диссертационного исследования были нравственные ценностные ориентации учащихся 5- 7 классов. Целью исследования стало изучение нравственных ценностных ориентаций подростков и определение оптимальных путей и эффективных форм их коррекции, становления и формирования средствами устного народного творчества.

В процессе исследования использовалась комплексная методика, включающая в себя изучение и анализ научной литературы по теме исследования, школьной документации, целенаправленное наблюдение, анкетирование, интервьюирование, беседы, социометрические методики, анализ педагогического опыта и педагогической практики, психолого-педагогический эксперимент, качественный анализ итогов эксперимента и статистических данных.

Результаты исследования позволили на основе аксиологического подхода разработать критерии и показатели, определить уровни сформированности нравственных ценностных ориентаций учащихся 5- 7 классов.

На основе разработанной методики изучения и использования произведений устного народного творчества определены оптимальные пути и формы успешного формирования нравственных ценностных ориентаций учащихся 5- 7 классов.

Опробированные формы и методы нравственных ценностных ориентаций подростков средствами фольклора применены и могут быть использованы в работе учителей белорусского языка и литературы, при чтении лекций, спецкурсов, проведении спецсеминаров и практических занятий на факультетах белорусской филологии педвузов, курсах повышения квалификации учителей, в процессе дальнейшего исследования проблем нравственного воспитания.

## SUMMARY

**Vladimir Vyacheslavovich Pashkevich**

**Moral value orientated upbringing of the 5- 7 form pupils by means of folk-lore.**

Key words: folk-lore, personal active method of approach, moral estimation, moral value orientation, moral value, moral qualities, necessity, sensually emotional sphere.

The object of the dissertation was moral value orientated upbringing of the 5- 7 form pupils. The aim of the research paper was to study the moral value orientated upbringing process of teen-agers and to define the optimum ways and effective forms of their corection, formation and development by means of folk-lore.

In the process of research complex methods were used including study and analysis of scientific papers on a research topic, analysis of school documents, intervienws, conversations, sociometrical methods and practice, psycho-pedagogical experiment, qualitative analysis of the results of experiment and statistic data.

The outcomes of the research work made it possible on the basis of a valuable approach to elaborate criteria and indiced, to define the levels of moral value orientated upbringing of the 5- 7 form pupils.

The conditions, the ways and the forms of a successful moral value orientated upbringing of the 5- 7 form pupils were determined on the basis of elaborated folk-lore investigation and application methods.

Approbated forms and methods of moral value orientated upbringing of teen-agers by means of folk-lore have been applied and can be used in the work of byelorussian language and literature teachers, while lecturing, holding special courses, seminars and practical hours at then byelorussian philological faculties of pedagogical institutes, advanced teachers' learning courses, in the process of further research.